# Тематический раздел

# Тэматычны раздзел

# Special topic section

## Право и правовая система ВКЛ (к 550-летию Судебника Казимира и 430-летию Третьего статута ВКЛ)

## Права і прававая сістэма ВКЛ (да 550-годдзя Судзебніка Казіміра і 430-годдзя Трэцяга статута ВКЛ)

## The Law and legal system of the Grand Duchy of Lithuania (to the 550th anniversary of the Code of Laws of Kazimierz and the 430th anniversary of the 3rd Statute of the Grand Duchy of Lithuania)

*УДК [94+340.130.5](474.5/476 ВКЛ)«15»*

# ПАРТИКУЛЯРИЗМ *VS* УНИФИКАЦИЯ: РАЗРАБОТКА И ПРИНЯТИЕ СТАТУТА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО 1588 г.

***В. А. ПОДОЛИНСКИЙ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Исследуется проблема сосуществования партикулярных и унификаторских тенденций в социально-политической жизни Речи Посполитой XVI в. На примере подготовки Третьего статута Великого княжества Литовского показаны попытки политического народа страны сохранить свою собственную систему права, отражено стремление

**Образец цитирования:**
Падалінскі У. А. Партыкулярызм *vs* уніфікацыя: распрацоўка і прыняцце Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. 2018. № 2. С. 10–20.

**For citation:**
Padalinski U. A. Particularism *vs* unification: elaboration and adoption of the Grand Duchy of Lithuania Statute of 1588. *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2018. No. 2. P. 10–20 (in Belarus.).

**Автор:**
***Владимир Алексеевич Подолинский*** – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета.

**Author:**
***Uladzimir A. Padalinski***, PhD (history), docent; head of the department of Belarus history of Ancient time and Middle Ages, faculty of history.
*ulpadalinski1978@gmail.com*

польской шляхты к унификации права двух субъектов Речи Посполитой. Предложена авторская концепция процесса разработки и принятия Статута 1588 г. Приводятся новые сведения, позволяющие пересмотреть некоторые традиционные положения, закрепленные в историографии проблемы. Отмечено, что результаты проведенного исследования являются важными для комплексного изучения политической истории Речи Посполитой, в частности ее государственного и правового строя, парламентской системы, отношений между Великим княжеством Литовским и Короной Польской.

***Ключевые слова:*** Статут ВКЛ; Великое княжество Литовское; Речь Посполитая; шляхта; партикуляризм; унификация; поветовые сеймики; вальный сейм.

# ПАРТЫКУЛЯРЫЗМ *VS* УНІФІКАЦЫЯ: РАСПРАЦОЎКА І ПРЫНЯЦЦЕ СТАТУТА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1588 г.

***У. А. ПАДАЛІНСКІ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Даследуецца праблема суіснавання партыкулярных і ўніфікатарскіх тэндэнцый у сацыяльна-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай XVI ст. На прыкладзе падрыхтоўкі Трэцяга статута Вялікага Княства Літоўскага паказаны спробы велікакняжацкага палітычнага народа захаваць сваю ўласную сістэму права, адлюстравана імкненне каroннай шляхты да ўніфікацыі права двух суб'ектаў Рэчы Паспалітай. Прапануецца аўтарская канцэпцыя працэсу распрацоўкі і прыняцця Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Прыводзяцца новыя звесткі, якія дазваляюць перагледзець некаторыя традыцыйныя палажэнні, замацаваныя ў гістарыяграфіі праблемы. Вынікі праведзенага даследавання з'яўляюцца важнымі для комплекснага вывучэння палітычнай гісторыі Рэчы Паспалітай, у прыватнасці яе дзяржаўнага і прававога ладу, парламенцкай сістэмы, адносін паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Каронай Польскай.

***Ключавыя словы:*** Статут ВКЛ; Вялікае Княства Літоўскае; Рэч Паспалітая; шляхта; партыкулярызм; уніфікацыя; павятовыя соймікі; вальны сойм.

# PARTICULARISM *VS* UNIFICATION: ELABORATION AND ADOPTION OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA STATUTE OF 1588

***U. A. PADALINSKI***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The study is devoted to the problem of the coexistence of particularistic and unifying tendencies in the socio-political life of the XVI century's Commonwealth. The example of the Grand Duchy of Lithuania Third Statute's drafting shows the attempts of the Lithuanian (in the historical meaning) political nation to retain its own system of law. On the other hand, it shows the intention of the Polish nobility to unify the law of the two subjects of the Commonwealth. The author's conception of the process of the Statute elaboration and adoption is given. New information is provided that permits reconsidering some of the traditional postulates fixed in the problem's historiography. The study's results are important for the comprehensive research of the political history of the Commonwealth, including its state, parliamentary and legal system, and relations between the Grand Duchy of Lithuania and the Polish Kingdom.

***Key words:*** Statute of the Grand Duchy of Lithuania; the Grand Duchy of Lithuania; the Commonwealth; nobility; particularism; unification; local diets (dietines); the General Diet.

Акт Люблінскай уніі 1569 г. дэкляраваў, што Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ) і Карона Польская становяцца *адным непадзельным і неадрозным целам, а таксама не рознай, але адной супольнай Рэччу Паспалітай*[1] [1, s. 235]. Гэтыя словы былі свайго роду праграмай уніфікацыі, прывядзення да аднастайнасці ўсіх сацыяльна-палітычных адметнасцей, якія існавалі ў абодвух суб'ектах Рэчы Паспалітай. Аднак ужо першыя дзесяцігоддзі сумеснага існавання ВКЛ і Польшчы ў межах рэальнай уніі паказалі, што велікакняжацкі палітычны народ паслядоўна імкнуўся абараняць і рэалізоўваць свае ўласныя, асобныя дзяржаўныя інтарэсы, якія часам маглі зусім не адпавядаць інтарэсам кароннага боку або манарха. Такую тэндэнцыю да захавання адасобленасці ВКЛ у палітычным жыцці Рэчы

[1]Тут і далей пераклад наш. – *У. П.*

Паспалітай на працягу XVI–XVIII стст. найбольш карэктна вызначаць тэрмінам «партыкулярызм» (гл., напрыклад, [2–4]).

Ва ўтворанай Рэчы Паспалітай з'явіліся супольныя для Польшчы і ВКЛ сферы грамадскіх адносін, якія неабходна было максімальна зблізіць. Сярод іншага польскі бок планаваў прывесці да адзінства сістэмы права ВКЛ і Кароны Польскай. Ужо на Люблінскім сойме 1569 г. пад уплывам каронных паслоў была прынята ўхвала (канстытуцыя), прысвечаная рэдагаванню Статута ВКЛ, якая прадугледжвала, па сутнасці, уніфікацыю права двух суб'ектаў Рэчы Паспалітай [1, s. 254–255]. Аднак праца над Статутам пайшла зусім па іншым шляху і наадварот толькі ўзмацніла адасобленасць прававой сістэмы ВКЛ. Мэта дадзенага артыкула якраз і заключаецца ў тым, каб на прыкладзе распрацоўкі і зацвярджэння новага Статута ВКЛ паказаць перапляценне партыкулярных і ўніфікатарскіх тэндэнцый у палітычным жыцці Рэчы Паспалітай апошняй трэці XVI ст.

Гісторыя вывучэння Статутаў ВКЛ налічвае ўжо не адно стагоддзе, па гэтай тэме апублікавана вялікая колькасць прац (агляд гістарыяграфіі гл., напрыклад, у працы Славаміра Годэка [5, s. 11–67]). Асобную традыцыю даследавання мае і працэс падрыхтоўкі Трэцяга статута ВКЛ. Сур'ёзнае навуковае вывучэнне гэтай праблемы распачаў расійскі гісторык Іван Лапа. Асаблівую ўвагу даследчык надаваў менавіта супрацьлеглым поглядам кароннага і велікакняжацкага бакоў на мэту стварэння новага кадыфікацыйнага акта ВКЛ [6, с. 190–222; 7, с. 100–105]. У 1930-х гг. выйшла фундаментальнае даследаванне І. Лапы, у якім аўтар грунтоўна разгледзеў ход распрацоўкі Трэцяга статута ВКЛ, гістарычны кантэкст, у якім ён ствараўся, яго змест і далейшы лёс, а таксама кола асоб, якія мелі дачыненне да яго з'яўлення [8]. У 1980-х гг. значны ўклад у вывучэнне працэсу падрыхтоўкі новага Статута ВКЛ і асабліва абставін яго зацвярджэння каралём польскім і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам Вазам зрабілі польскія даследчыкі Генрык Віснер [9; 10] і Юліуш Бардах [11, s. 39–53; 12, s. 321–327]. У пачатку XXI ст. у сваіх працах Генрык Люлевіч [13] і Анджэй Закшэўскі [14, s. 219–231] зрабілі пэўнае падсумаванне вынікаў, якіх дасягнулі гісторыкі ў даследаванні праблемы распрацоўкі трэцяга кадыфікацыйнага акта ВКЛ. Беларуская гістарычная навука таксама не засталася ў баку ад вывучэння асаблівасцей падрыхтоўкі Статута ВКЛ 1588 г. У прыватнасці, некаторыя аспекты гэтага працэсу разглядаў Андрэй Радаман [15]. Разам з тым уздым цікавасці сучасных навукоўцаў да праблемы «літоўскага партыкулярызму», спробы перагляду старых палажэнняў і выпрацоўкі новых падыходаў да яе вывучэння сведчаць пра неабходнасць далейшага даследавання ўсіх акалічнасцей рэдагавання і прыняцця Трэцяга статута ВКЛ, асабліва ў кантэксце адносін ВКЛ і Польшчы ў складзе Рэчы Паспалітай. Вызначаная даследчая праблема абумовіла і выбар адпаведных гістарычных крыніц, асноўнымі з якіх сталі гаспадарскія прывілеі, пастановы соймікаў ды партыкулярных з'ездаў ВКЛ, а таксама ўхвалы вальных соймаў Рэчы Паспалітай. Надзвычай важную інфармацыю ўтрымліваюць соймавыя дыярыушы і эпісталярныя крыніцы.

На Люблінскім сойме 1569 г. у час дыскусій аб умовах уніі польскія сенатары і паслы неаднаразова звярталі ўвагу на шэраг норм Статута ВКЛ 1566 г., якія супярэчылі іх імкненню да ўніфікацыі дзяржаўных суб'ектаў ВКЛ і Польшчы. У прыватнасці, разглядаліся арт. 3, 6 і 9 трэцяга раздзела, якія гарантавалі захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці ВКЛ і правядзенне асобнага вальнага сойма, а таксама забаранялі іншаземцам, у тым ліку палякам, займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ [16, с. 14–17; 17, с. 80–81]. Польскі бок настойваў на абранні дэпутатаў, якія б уважліва перапрацавалі Статут 1566 г. і выправілі падобныя «супярэчнасці» [16, с. 528, 529–530]. Разам з тым рэдагаванне Статута ВКЛ з'яўлялася актуальнай задачай і для самой шляхты ВКЛ. Некаторыя папраўкі да яго артыкулаў былі ўнесены ўжо ў 1566–1568 гг. на соймах ВКЛ у Берасці і Гародні [8, с. 157–186; 18, с. 73–74]. Акрамя таго, на сойме 1568 г. у Гародні *на поправенье статуту* была створана адмысловая камісія, якая мелася прыступіць да працы ўжо ў жніўні таго ж года [14, s. 219; 15, с. 24–25; 18, с. 74–75; 19, стб. 466–468]. Аднак па розных прычынах гэта камісія сваю дзейнасць так і не распачала [20, с. 42].

Па выніках нарад на Люблінскім сойме 1569 г. утваралася новая камісія па рэдагаванні Статута ВКЛ. Яна павінна была ўзгадніць велікакняжацкі акт кадыфікацыі са Статутам Кароны Польскай 1506 г., каб *ужо ва ўсіх дзяржавах нашых, як у адзінай Рэчы Паспалітай, аднолькавая і неадкладная справядлівасць людзям ажыццяўляцца магла* [1, s. 254–255] (гл. таксама [11, s. 39]). Праца мусіла распачацца 11 лістапада 1569 г. у Вільні, а яе выніку трэба было прадставіць на наступным вальным сойме Рэчы Паспалітай. На фінансаванне дзейнасці дэпутатаў у ВКЛ прызначаўся спецыяльны падатак, стаўка якога складала 1 грош з аселай валокі і службы, 8 пенязяў з падляшскіх дымоў, 4 пенязі з агароднікаў, 1 грош з путных і панцырных баяр і 2 грошы са шляхты, якая не валодала сялянамі [1, s. 255].

На сойме ў Любліне быў зацверджаны і персанальны склад гэтай камісіі. З ліку сенатараў ВКЛ дэпутатамі сталі віленскі біскуп Валерыян Пратасевіч і жамойцкі кашталян Мальхер Шэмет. Пры іх павінен быў працаваць каралеўскі сакратар, віленскі войт Аўгустын Ратундус. Ад шляхты ў яе склад прызначалася па адной асобе ад кожнага ваяводства: стольнік ВКЛ Мікалай Дарагастайскі ад Віленскага ваяводства, гаспадарскі маршалак Лукаш Свірскі ад Трокскага ваяводства, Ян Сцяцковіч

ад Жамойцкага староства, гаспадарскі маршалак Бенедыкт Юрага ад Навагародскага ваяводства, віцебскі падкаморы Павел Друцкі-Саколінскі ад Полацкага ваяводства, Ян Сколка ад Віцебскага ваяводства, берасцейскі харужы і земскі суддзя Кірдзей Крычоўскі ад Берасцейскага ваяводства, мсціслаўскі харужы і земскі суддзя Багдан Сяліцкі ад Мсціслаўскага ваяводства і менскі земскі пісар Марцін Валадковіч ад Менскага ваяводства. Вядзенне справаводства даручалася віленскаму земскаму пісару: Андрэю Мацковічу і ашмянскаму земскаму пісару Пятру Саковічу [1, s. 254–255] (гл. таксама [8, с. 188–207; 10, s. 36; 20, с. 43]). Такім чынам, з аднаго боку, дэпутаты павінны былі максімальна зблізіць права двух суб'ектаў Рэчы Паспалітай, аднак, з другога боку, камісія складалася выключна з прадстаўнікоў ВКЛ, што давала магчымасць накіраваць яе працу на захаванне асобнай сістэмы права ВКЛ.

Наступны вальны сойм Рэчы Паспалітай праходзіў у маі – ліпені 1570 г. Зразумела, што за такі кароткі час узгадніць велікакняжацкі акт кадыфікацыі з каронным правам і сфармуляваць адпаведныя папраўкі камісія проста не магла. Свой негатыўны ўплыў на яе дзейнасць магла аказаць і цяжкая эканамічная сітуацыя, у якой апынулася ВКЛ у выніку Інфлянцкай вайны. Заўважым, што абраныя ў Любліне дэпутаты таксама павінны былі разглядаць справаздачы аб зборы шматлікіх падаткаў, ухваленых у ВКЛ у 1560-х гг. [1, s. 255; 20, с. 73–76]. Ва ўмовах гаспадарчага крызісу гэты абавязак, безумоўна, замінаў камісіі займацца сваёй галоўнай задачай. Не выключана, што яе дзейнасць магла тармазіцца і той часткай палітычнай эліты ВКЛ, якая выступала супраць уніфікатарскіх тэндэнцый, сфармуляваных у соймавай канстытуцыі 1569 г. Аднак праца па рэдагаванні Статута ВКЛ пэўны водгук сярод шляхты ВКЛ усё ж атрымала. Так, на сойміку Віленскага павета напярэдадні вальнага сойма 1570 г. шляхта прасіла надрукаваць Статут ВКЛ і ўключыць у яго ўсе земскія прывілеі ВКЛ [21, s. 179]. Агульны соймік Трокскага ваяводства, які адбыўся ў снежні 1571 г. у Самілішках, даручаў паслам на вальным сойме 1572 г. пільна прасачыць за тым, каб у Статуце ВКЛ былі выпраўлены ўсе парушэнні шляхецкіх вольнасцей [22, с. 250].

Пасля смерці караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста ў ліпені 1572 г. Рэч Паспалітая ўступіла ў перыяд першага бескаралеўя. У гэты час палітычны народ ВКЛ пачаў барацьбу за перагляд некаторых умоў Люблінскай уніі 1569 г., накіраваны на ўмацаванне пазіцый ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (гл., напрыклад, [13, s. 80–160]). Сярод іншага шляхта ВКЛ здолела юрыдычна замацаваць права самастойна працаваць над унясеннем змен у сваё заканадаўства. Так, на элекцыйным сойме 1573 г. у склад Генрыкавых артыкулаў быў уключаны пункт, які, па-першае, дазваляў станам ВКЛ, а таксама шляхце Валынскага, Кіеўскага і Брацлаўскага ваяводстваў Польшчы, якая карысталася *літоўскім правам*, абмеркаваць папраўкі ў Статут ВКЛ 1566 г. і парадак судаводства ды прадставіць іх на зацвярджэнне каралю на будучым каранацыйным сойме. Па-другое, велікакняжацкай шляхце на далейшыя часы гарантавалася магчымасць свабодна праводзіць рэфармаванне *праў сваіх і судоў* [1, s. 328–329; 8, с. 326–327, 382–384; 10, s. 38]. Удзельнікі сойміка Віленскага ваяводства напярэдадні каранацыі ў кастрычніку 1573 г. выставілі даволі катэгарычныя патрабаванні новаму каралю і вялікаму князю Генрыху Валуа: *Права и волности н(а)ши в Статуте литовскомъ описаные, которые Его Королевъская М(и)л(о)сть г(оспо)д(а)рь нашъ теперешний попрысягнути рачыть, в чомъ намъ поправы будеть потреба а на што ся вси ихъ м(и)л(о)сть п(а)нове рады, станы и рыцеръство зговять и постановять, то Его Королевъская М(и)л(о)сть намъ держжати и твердити будеть повинен* [23, s. 79]. І хаця Генрыкавы артыкулы былі зацверджаны толькі ў 1576 г. прысягай наступнага караля і вялікага князя Стэфана Баторыя [1, s. 357, 368; 11, s. 40], падыход шляхты ВКЛ да працэсу рэфармавання свайго заканадаўства, відавочна, заключаўся ў тым, што ўсе папраўкі павінны выпрацоўвацца самастойна станамі ВКЛ у адпаведнасці з іх патрэбамі і падавацца на канчатковае зацвярджэнне каралю і вялікаму князю. Пра нейкае ўзгадненне гэтых папраўк з польскім бокам гаворка нават не вялася.

Акрамя гэтага, у часы бескаралеўя з'явіліся і канкрэтныя вынікі працы камісіі па паправе Статута ВКЛ 1566 г. Так, на каранацыйным сойме 1574 г. Генрыху Валуа быў прадстаўлены на зацвярджэнне адзін папраўлены статутны артыкул. Манарх нават выдаў адпаведны прывілей, але артыкул так у дзеянне і не ўступіў, паколькі не быў зацверджаны канстытуцыяй сойма (каранацыя завяршылася без прыняцця рашэнняў) [17, с. 227–228; 24, s. 193, 198–199, 203–205]. Пазнейшыя падзеі пакажуць, што камісія да восені 1574 г. падрыхтавала і іншыя папраўкі да кадыфікацыйнага акта ВКЛ.

Важна падкрэсліць, што ўжо з 1574 г. праца па рэдагаванні Статута ВКЛ 1566 г. перайшла ў рукі ўсяго палітычнага народа ВКЛ. Пасля ўцёкаў Генрыха Валуа з Рэчы Паспалітай у Вільні ў жніўні 1574 г. адбыўся даволі прадстаўнічы з'езд сенатараў і шляхты, які вырашыў склікаць паспалітае рушэнне на выпадак магчымай агрэсіі з боку Маскоўскай дзяржавы. Пры гэтым у час збору войска маглі абмяркоўвацца і розныя пытанні дзяржаўнага жыцця. Адным з іх якраз і з'яўлялася паправа Статута ВКЛ [13, s. 168; 23, s. 98]. На кастрычнік 1574 г. у Вільні быў прызначаны з'езд станаў ВКЛ, якому папярэднічалі соймікі ў паветах і ваяводствах. На сойміках шляхта абмяркоўвала ў тым ліку ўнясенне паправак у Статут ВКЛ, *до которого абы и привилия земския вписованы были для постановеня судов и по-*

*радку в справедливости* [25, с. 103]. З'езд, які працаваў у кастрычніку – лістападзе 1574 г., перадаў *паправу Статута* ВКЛ, падрыхтаваную камісіяй 1569 г., на разгляд павятовых гродскіх і земскіх судоў ВКЛ. Выказаныя прапановы меркавалася ўзгадніць на асобным з'ездзе ВКЛ. У сваю чаргу, вынікі абмеркавання планавалася зацвердзіць на вальным сойме Рэчы Паспалітай [13, s. 185; 23, s. 126]. З гэтага часу ў абмеркаванні і ўдакладненні статутных норм маглі браць непасрэдны ўдзел шырокія колы шляхты з усіх зямель ВКЛ. Аб спыненні дзейнасці камісіі 1569 г. сведчыць таксама складзеная 28 сакавіка 1576 г. інструкцыя паслам Жамойцкага староства на з'езд станаў ВКЛ у Гародні. Жамойцкая шляхта прасіла абраць для рэдагавання Статута *невялікую колькасць асоб, якія б, не будучы занятыя ўласнымі справамі, усёй дзяржаве паслужыць маглі* [26, s. 458].

Каранацыя Стэфана Баторыя ў 1576 г. і пэўная стабілізацыя ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай спрыялі актывізацыі працы над папраўкай Статута ВКЛ. Новы кароль склікаў свой першы вальны сойм у Торуні на кастрычнік 1576 г., і адным з пытанняў, вынесеных на яго разгляд, стала рэдагаванне вялікакняжацкага акта кадыфікацыі. У адпаведнасці з ухвалай Люблінскага сойма 1569 г. і Генрыкавымі артыкуламі 1573 г., Стэфан Баторый заклікаў павятовую шляхту прадставіць на сойме, *што се колвекъ поправило и еще до сойму валного поправит может*[2]. Цалкам магчыма, што дэлегацыя ВКЛ была гатова падаць на зацвярджэнне манарху некаторыя папраўленыя артыкулы, але сойм скончыўся без прыняцця канстытуцый. У такіх абставінах земскія паслы ВКЛ салідарна прасілі караля склікаць у ваяводствах і паветах ВКЛ соймікі, а пасля іх – асобны з'езд *около намовы о порадку справедливости и о поправенье статуту*. Стэфан Баторый згадзіўся з такой просьбай і прызначыў павятовыя соймікі на 20 студзеня 1577 г. (супадалі з сесіямі земскіх судоў), а *зъездъ головный* у Вільні – на 3 сакавіка 1577 г. Ухваленыя рашэнні кароль абяцаў зацвердзіць на наступным сойме[3] [27, s. 38]. Аднак гэты з'езд, напэўна, не адбыўся [13, s. 299–300]. Падаецца, прадстаўнікі ВКЛ свядома імкнуліся перанесці рэдагаванне Статута ВКЛ на партыкулярны ўзровень грамадскага жыцця. Праца на павятовых сойміках і асобных з'ездах дазваляла мясцоваму палітычнаму народу звесці да мінімуму ўплыў кароннай шляхты на рэфармаванне вялікакняжацкага права, а значыць, і захаваць сваю асобную прававую сістэму. У ВКЛ сапраўды асцерагаліся ўніфікатарскіх памкненняў з боку Кароны Польскай. Трокскі кашталян падканцлер Астафей Валовіч у лісце ад 11 сакавіка 1577 г. заклікаў віленскага ваяводу канцлера Мікалая Радзівіла Рудога актывізаваць дзейнасць па паправе Статута ВКЛ. У адваротным выпадку, папярэджваў А. Валовіч, *ніякая рэч, толькі Статут наш літоўскі прывядзе нас пад права і ўрады іншыя*, гэта значыць каронныя [13, s. 300].

У інструкцыі на павятовыя соймікі ВКЛ напярэдадні наступнага сойма Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый прасіў шляхту прадставіць *што до поправы естъ готового* [28, приложения, с. 111]. Відаць па ўсім, у снежні 1577 г. на сойміках у паветах і на галоўным сойміку ВКЛ у Ваўкавыску адбылося плённае абмеркаванне змяненняў у Статуце ВКЛ. Вальны сойм, які праходзіў у Варшаве ў студзені – сакавіку 1578 г., сваёй канстытуцыяй зацвердзіў увядзенне ў дзеянне 9 папраўленых і новых статутных артыкулаў, падрабязна апісаных у асобным гаспадарскім прывілеі. Канцылярыя ВКЛ павінна была разаслаць копіі гэтых артыкулаў ва ўсе паветы і ваяводствы [1, s. 412; 11, s. 41; 17, с. 223–234; 24, s. 195–203]. Сярод іх быў таксама артыкул, узгоднены яшчэ на каранацыі 1574 г. Звернем увагу на тое, што папраўкі да Статута ВКЛ уводзіліся ў дзеянне прывілеем манарха *па просьбе паноў-рады і паслоў Вялікага Княства Літоўскага*, а соймавая канстытуцыя толькі надавала ім юрыдычную сілу. А гэта сведчыць пра тое, што сам змест статутных артыкулаў на пасяджэннях сойма з сенатарамі і пасламі Кароны Польскай не абмяркоўваўся [24, s. 193–195].

Акрамя таго, сойм 1578 г. прыняў яшчэ адну пастанову, якая вызначала, што, згодна з умовамі Люблінскай уніі, ВКЛ захавала ўласнае права, а рэдагаванне Статута 1566 г. павінна адбывацца ў адпаведнасці з канстытуцыяй 1569 г. і Генрыкавымі артыкуламі [1, s. 411]. Для далейшай працы над папраўкай кадыфікацыйнага акта ў ВКЛ на 23 мая 1578 г. скліканіся спецыяльныя ваяводскія соймікі, а на 29 верасня 1578 г. – асобны з'езд у Навагародку. Выпрацаваныя на сойміках і з'ездзе рашэнні трэба было прадставіць на бліжэйшым сойме Рэчы Паспалітай для каралеўскага зацвярджэння [1, s. 411–412; 6, с. 196–197]. Аднак, падобна, актывізацыя баявых дзеянняў з Маскоўскай дзяржавай так і не дазволіла правесці гэты з'езд [8, с. 367–368, 390–392; 13, s. 317–318].

Тым не менш ужо на наступны вальны сойм 1579–1580 гг. былі прадстаўлены яшчэ некалькі папраўленых артыкулаў Статута ВКЛ. Аднак сойм завяршыўся без ухвалення канстытуцый, быў прыняты толькі падатковы ўніверсал [1, s. 431–444; 8, с. 392]. Затым на галоўным з'ездзе ВКЛ у красавіку 1580 г. вялікакняжацкія сенатары і шляхта звярнуліся да Стэфана Баторыя з просьбай зацвердзіць некаторыя змены ў Статуце ВКЛ, што кароль паабяцаў зрабіць на чарговым вальным сойме [8, с. 368–370, 392–393; 13, s. 330–331; 28, приложения, с. 132–133]. Сойм адбыўся ў Варша-

[2]Рос. нац. б-ка в Санкт-Петербурге. Ф. 293. Западно-русские акты. № 275. Л. 2.
[3]Нац. гіст. арх. Беларусі ў Мінску. Ф. КМФ–18. Воп. 1. Спр. 56. Арк. 36 – 36 адв.

ве ўжо ў студзені – сакавіку 1581 г. Менавіта на ім было ўхвалена стварэнне ў ВКЛ вышэйшай судовай апеляцыйнай установы – Трыбунала ВКЛ. Таксама соймавымі канстытуцыямі зацвярджаліся некаторыя артыкулы, якія пасля ўвайшлі ў тэкст Трэцяга статута ВКЛ [1, s. 452; 8, с. 396–397]. Абмеркаванне норм, якія рэгулявалі разгляд спраў паміж свецкімі і духоўнымі асобамі, адкладалася на пазнейшы час, паколькі на сойме не было нікога з прадстаўнікоў духавенства ВКЛ [1, s. 452].

Яшчэ адна соймавая канстытуцыя вызначала далейшую працэдуру паправы Статута ВКЛ. Так, у ВКЛ для рэдагавання акта кадыфікацыі неабходна было абраць дэпутатаў, якія б прадставілі вынікі сваёй працы для канфірмацыі каралю і вялікаму князю на будучым сойме [1, s. 452; 8, с. 395–396]. Зноў дэлегацыя ВКЛ падкрэсліла сваё імкненне самастойна, без узгаднення з польскім бокам, весці распрацоўку статутных норм і падаваць на супольным сойме ўжо гатовыя артыкулы толькі на зацвярджэнне манарху. Гэта не магло не выклікаць занепакоенасці ў каронных паслоў. Відаць, менавіта з іх ініцыятывы ў канстытуцыі спецыяльна агаворвалася, што паправа Статута ВКЛ ні ў чым не павінна парушаць умоў Люблінскай уніі [1, s. 452]. Стэфан Баторый 8 сакавіка 1581 г. выдаў прывілей, у якім больш падрабязна асвятліў парадак увядзення ў дзеянне Трыбунала ВКЛ, а таксама акрэсліў ход працы па рэдагаванні Статута ВКЛ [13, s. 338–339][4]. У паветах ВКЛ на 10 красавіка 1581 г. склікаліся сойміκі, на якіх шляхце трэба было абраць па адным дэпутаце *людзей добрых, годных, у праве ВКЛ умелых*. Для выбараў дэпутатаў са складу паноў-рады на 24 красавіка прызначаўся з’езд у Вільні. Абраным асобам даручалася з’ехацца 8 верасня 1581 г. для канчатковай паправы Статута ВКЛ. У сваёй працы яны павінны былі ўлічыць ухвалены Трыбунал ВКЛ, усе папярэднія змяненні, у тым ліку *і першую статутную паправу*, створаную камісіяй 1569 г. Для матэрыяльнага забеспячэння дэпутатаў у ВКЛ уводзіўся спецыяльны падатак. Яго стаўка з аселай валокі або службы складала 2 грошы з *дыма рускага* і 1 грош з *дыма палескага*. Путныя баяры павінны былі плаціць 2 грошы, мяшчане, якія не валодалі зямлёй, выплачвалі 1 грош, агароднікі – паўгроша, а бяднейшая шляхта – 4 грошы з дома. На гаспадарскіх падданых падатак не распаўсюджваўся[5]. Статутную паправу камісіі трэба было прадставіць на галоўным сойміку ў Ваўкавыску перад соймам Рэчы Паспалітай для абмеркавання ўсімі станамі ВКЛ. Затым узгоднены варыянт Статута ВКЛ падаваўся каралю, які абяцаў, што пасля нарады з раднымі панамі ВКЛ, *як слушна будзе выдаць яго загадае* [13, s. 338–339][6]. Праца па рэдагаванні Статута ВКЛ 1566 г. уваходзіла ў завяршальную фазу.

Абраныя павятовай шляхтай дэпутаты ўжо да пачатку 1582 г. закончылі працу над папраўкамі да акта кадыфікацыі, а вось паны-рада сваіх прадстаўнікоў так і не вызначылі. На галоўным сойміку ВКЛ у студзені 1582 г.[7] шляхта прасіла, каб дэлегаты ад паноў-рады ў бліжэйшы час распачалі рэдагаванне Статута ВКЛ, і звярталася да Стэфана Баторыя, каб ён *рачилъ обрать собе дни и часы ку выслуханью зъ ихъ милости паны радами тотъ статутъ, жебы безъ всякой вонтпливости статутъ поправленый до конфирмации его королевское милости водлугъ констытуции соймовое на сейме напервши принесенъ и намъ выданъ былъ* [6, с. 190–191; 29, с. 179–180]. Такім чынам, распачатая ў 1569 г. рэдакцыйная праца ўжо ў 1582 г. прывяла да стварэння новага кадыфікацыйнага акта ВКЛ. Заўважым таксама, што станы ВКЛ прасілі караля і вялікага князя асобна з панамі-радай разгледзець праект Статута ВКЛ, а на сойме толькі яго зацвердзіць.

Падпісанне 15 студзеня 1582 г. Ям-Запольскага перамір’я і завяршэнне Інфлянцкай вайны давала палітычнай эліце больш часу на тое, каб заняцца канчатковай падрыхтоўкай новага Статута ВКЛ. Хоць і са спазненнем, але сваіх дэпутатаў абралі і радныя паны. На галоўным сойміку ў верасні 1582 г. сенатары і земскія паслы ВКЛ правялі карэктуру новай паправы. Аднак зноў паўсталі супярэчнасці ў пытанні рэгулявання юрыдычных адносін паміж свецкімі і духоўнымі асобамі. Прадстаўнікі каталіцкага духавенства нават выступілі ў Ваўкавыску з адпаведнай пратэстацыяй. Дарэчы, яе змест дазваляе дапусціць, што ў склад новай камісіі па падрыхтоўцы Статута ВКЛ ад паноў-рады ўваходзілі віленскі біскуп Юрый Радзівіл, кіеўскі біскуп Мікалай Пац, віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Руды і віленскі кашталян і канцлер Астафей Валовіч [33, s. 71–72]. Падтрымліваем меркаванне польскага гісторыка Г. Люлевіча пра тое, што, нягледзячы на гэту пратэстацыю, ужо на той момант палітычны народ ВКЛ лічыў новы Статут ВКЛ цалкам падрыхтаваным да ўвядзення ў дзеянне [13, s. 345–346]. Тэхнічная праца па афармленні ўсіх правак і звядзенні артыкулаў у адзін кодэкс належала канцылярыі ВКЛ [8, с. 435–473; 11, s. 43–44]. На нашу думку, найважнейшую ролю ў складанні канчатковага тэксту Трэцяга статута ВКЛ адыграў віленскі кашталян Астафей Валовіч, які з 1579 па 1587 г. займаў пасаду канцлера ВКЛ і непасрэдна браў удзел у распрацоўцы велікакняжацкага акта кадыфікацыі.

[4]Arch. Głów. Akt Daw. w Warszawie (далей – AGAD). Zb. Branickich z Suchej. Sygn. 147/171. S. 196–201.
[5]Там жа. S. 199.
[6]Там жа. S. 198–199.
[7]Галоўныя соймікі ВКЛ, Малой і Вялікай Польшчы ў студзені 1582 г. мелі надзвычайны характар і праводзіліся без склікання вальнага сойма Рэчы Паспалітай [13, s. 343–344].

Ужо на сойме Рэчы Паспалітай у кастрычніку – лістападзе 1582 г. дэлегацыя ВКЛ прапанавала зацвердзіць новы Статут ВКЛ. Як можна меркаваць, прадстаўнікі ВКЛ настойвалі на яго зацвярджэнні манархам без усякага абмеркавання. Аднак такая прапанова сутыкнулася з супрацівам польскіх земскіх паслоў. На пасяджэннях 29 і 30 кастрычніка 1582 г. яны запатрабавалі дэталёвага разгляду ў пасольскай ізбе ўсіх змен у Статуце ВКЛ [34, s. 342]. У выніку пытанне яго зацвярджэння на сойме 1582 г. не атрымала развіцця. З аднаго боку, такая пазіцыя каронных паслоў была абумоўлена бояззю таго, што ў ВКЛ могуць быць парушаны правы каталіцкага духавенства [13, s. 348]. З другога боку, польскі палітычны народ меў усе падставы падазраваць, што новы Статут ВКЛ не зблізіць права дзвюх частак Рэчы Паспалітай, а толькі ўзмоцніць адасобленасць прававой сістэмы ВКЛ.

Вальны сойм 1582 г. скончыўся безвынікова. Урэгуляванне ўсіх супярэчнасцей вакол статутных норм зноў было перанесена на партыкулярны ўзровень. Летам 1583 г. манарх у адпаведнасці з соймавай канстытуцыяй 1581 г. склікаў галоўны з'езд ВКЛ, спецыяльна прысвечаны канчатковай паправе Статута ВКЛ. З'езд працаваў у Вільні з канца студзеня па 25 сакавіка 1584 г. Абмеркаванне цягнулася доўга і напружана. Шэраг артыкулаў паны-рада і земскія паслы зацвердзілі, але па некаторых пытаннях да згоды прыйсці не змаглі. Узгадненне спрэчных артыкулаў было вырашана перанесці на соймікі ў паветах і галоўны соймік у Ваўкавыску перад будучым соймам, а ўжо адтуль, *намовившы се сполне и згодне, на съеимъ до Его К[о]р[олевское] М[и]л[о]сти ку стверъженью прынести се то маеть* [1, s. 452; 6, с. 199–205; 13, s. 348–350; 28, приложения, с. 134–139; 29, с. 180]. Стэфан Баторый 25 сакавіка 1584 г. накіраваў у паветы і ваяводствы ўніверсалы, у якіх запэўніў станы ВКЛ, што ён зацвердзіць на сойме ўзгоднены праект Статута [30, с. 78].

Пасля абмеркавання на павятовых сойміках[8] паправа Статута ВКЛ была прадстаўлена на галоўны соймік ВКЛ, які працаваў у Ваўкавыску 17–21 снежня 1584 г. У прыватнасці, сенатары (віленскі біскуп Юрый Радзівіл, віленскі кашталян і канцлер Астафей Валовіч, полацкі ваявода Мікалай Дарагастайскі, менскі кашталян і земскі падскарбі Ян Глябовіч) і земскія паслы ўрэшце ўзгаднілі пяць артыкулаў, якія рэгулявалі адносіны паміж асобамі духоўнага і свецкага стану [6, с. 205–208; 30, s. 78–85]. Лічым, што М. Дарагастайскі і Я. Глябовіч замянілі ў сенатарскай частцы статутнай камісіі М. Радзівіла Рудога (памёр у красавіку 1584 г.) і М. Паца (памёр у канцы 1584 – пачатку 1585 г.). У цэлым новы кадыфікацыйны акт ВКЛ быў падрыхтаваны. Напрыканцы сойма Рэчы Паспалітай 26 лютага 1585 г. земскія паслы ВКЛ *прынеслі таксама свой Статут, аб якім, каб быў зацверджаны, прасілі* [31, s. 267]. Відавочна, што велікакняжацкая шляхта зноў імкнулася зацвердзіць Статут ВКЛ цалкам без узгаднення яго норм з каронnымі пасламі. Аднак і на гэты раз дасягнуць сваёй мэты яны не здолелі. Польскі бок настойваў на падрабязным абмеркаванні кадыфікацыйнага акта на соймавых пасяджэннях, а Стэфан Баторый, верагодна, не хацеў аднаасобна ўводзіць яго ў дзеянне без дасягнення згоды паміж палітычнымі народамі ВКЛ і Польшчы. Сойм 1585 г., абцяжараны ўнутрыпалітычнымі праблемамі Рэчы Паспалітай (так званай справай Збароўскіх), скончыўся без прыняцця канстытуцый.

Пасля смерці Стэфана Баторыя ў Гародні 12 снежня 1586 г. Рэч Паспалітая ўвайшла ў перыяд бескаралеўя. Тым не менш і ў такой надзвычайнай сітуацыі праца па ўдакладненні некаторых статутных норм у ВКЛ працягвалася. Так, у студзені 1587 г. соймік Жамойцкага староства прапаноўваў скасаваць «новаскладзены» артыкул аб абразе каралеўскай асобы, а соймік Новагародскага павета ў маі 1587 г. даручаў сваім паслам на элекцыйным сойме гэты артыкул *поправить*[9] [32, с. 166]. Прынятая на канвакацыйным сойме Рэчы Паспалітай у сакавіку 1587 г. генеральная канфедэрацыя прадугледжвала, што станы ВКЛ на сойміках перад будучай элекцыяй абяруць як з сенатараў, так і са шляхты дэпутатаў на рэдагаванне Статута ВКЛ і Трыбунала ВКЛ [33, s. 21]. Аднак, відаць па ўсім, новая камісія не была створана, а ўсе папраўкі абмяркоўваліся непасрэдна на павятовых сойміках і з'ездах ВКЛ. Канчатковае ўзгадненне тэксту Статута ВКЛ адбылося на элекцыйным сойме Рэчы Паспалітай летам 1587 г. [13, s. 381; 17, с. 223; 34, с. 42].

У часы бескаралеўя палітычны народ ВКЛ яшчэ больш выразна падкрэсліваў самастойнасць у працы над удасканаленнем свайго права. Напрыклад, ва ўхвале галоўнага сойміка ВКЛ, скліканага ў чэрвені 1587 г. напярэдадні элекцыйнага сойма, адназначна сцвярджалася, што паправа Статута ВКЛ і Трыбунала ВКЛ – гэта *справы властные одному народу нашому литовскому и рускому належачые* [23, s. 244, 252]. Па меркаванні велікакняжацкай шляхты, зацвярджаць новы Статут ВКЛ павінен толькі кароль і вялікі князь без усякага ўмяшання ў гэты працэс польскага боку. У Польшчы, у якой былі распаўсюджаны ідэі аб поўнай уніфікацыі сістэм права двух суб'ектаў Рэчы Паспалітай, глядзелі на гэту праблему зусім інакш. Так, у час бескаралеўя частка польскай шляхты ўвогуле прапаноўвала, каб рэформа права скончылася стварэннем агульнага для ВКЛ і Кароны Польскай Статута [11, s. 39; 13, s. 389].

[8]Рос. нац. б-ка в Санкт-Петербурге. Ф. 293. Западно-русские акты. № 300. Л. 1.
[9]AGAD. Arch. Radziwiłłów. Dział II. Sygn. 165. S. 2.

Тым часам на элекцыі ў жніўні 1587 г. адбыўся раскол, і каралём былі абраны адразу два кандыдаты на ўладу ў Рэчы Паспалітай: эрцгерцаг Максімільян Габсбург і шведскі каралевіч Жыгімонт Ваза. Шляхта ВКЛ афіцыйна не прызнала абрання ні першага, ні другога [13, s. 379–388]. Восенню 1587 г. Рэч Паспалітая апынулася ў стане грамадзянскай вайны. Палітычны народ ВКЛ, нягледзячы на раскол і ў сваіх шэрагах, у перамовах з прадстаўнікамі абедзвюх «партый» імкнуўся забяспечыць свае партыкулярныя інтарэсы. Асноўнымі патрабаваннямі, якія велікакняжацкая шляхта прадстаўляла абодвум прэтэндэнтам, былі заключэнне доўгатэрміновага міру з Маскоўскай дзяржавай, далучэнне ўсіх Інфлянтаў толькі да ВКЛ, а таксама зацвярджэнне новага Статута ВКЛ (гл., напрыклад, [23, s. 268, 271, 289, 309–310, 312][10].

Паступова ў выніку актыўных палітычных захадаў і вайсковых перамог усё большую папулярнасць сярод шляхты Рэчы Паспалітай набывала кандыдатура Жыгімонта Вазы. З'езд станаў ВКЛ у снежні 1587 г. таксама выказаўся за прызнанне ўлады шведскага каралевіча і накіраваў на яго каранацыю, якая ўжо распачалася ў Кракаве, спецыяльную дэлегацыю на чале з трокскім ваяводам Янам Глябовічам і падканцлерам ВКЛ Львом Сапегам [13, s. 407–409]. Каранацыя Жыгімонта Вазы адбылася 27 снежня 1587 г., але Максімільян Габсбург працягваў узброеную барацьбу за ўладу ў Рэчы Паспалітай.

Афіцыйная дэлегацыя ВКЛ прыбыла на каранацыйны сойм 8 студзеня 1588 г., 11 студзеня павітала Жыгімонта Вазу і 14 студзеня распачала перамовы з каралём і польскім бокам [13, s. 410–412][11]. У польскай гістарыяграфіі, хоць і з пэўнымі агаворкамі, замацаваўся погляд, у адпаведнасці з якім на пасяджэннях пасольскай ізбы 21, 23 і 25 студзеня адбываліся спрэчкі паміж прадстаўнікамі ВКЛ і Кароны Польскай вакол *korrektury iuris*, гэта значыць Статута ВКЛ [9, s. 217; 10, s. 39–40; 11, s. 50; 12, s. 325–326]. Адпаведна, робіцца выснова пра тое, што акт кадыфікацыі ВКЛ быў зацверджаны пасля яго абмеркавання на супольным сойме (гл., напрыклад, [13, s 418–419]). Аднак уважлівае прачытанне дыярыушаў каранацыйнага сойма за 21–25 студзеня 1588 г.[12] дазваляе выказаць думку аб тым, што згаданая карэктура не звязана з перамовамі з дэлегацыяй ВКЛ. Напрыклад, 22 студзеня каронныя сенатары прасілі земскіх паслоў адкласці завяршэнне сойма, паколькі яшчэ *ні з Літвой не маем канца, ні korrektura jurium не абмеркавана*[13]. Больш за тое, можна сцвярджаць, што сам тэрмін *korrektura iuris* адносіўся не да Статута ВКЛ, а да праекта польскага акта кадыфікацыі. Так, на пачатку каранацыі 29 снежня 1587 г., калі афіцыйнай дэлегацыі ВКЛ у Кракаве яшчэ не было, каронныя паслы прасілі Жыгімонта Вазу выплаціць грошы дэпутатам, якія *сядзелі на korrekturze iuris*[14]. А ў рэцэсе каранацыі на разгляд наступнага вальнага сойма пераносіўся артыкул аб *выпраўленні парушэнняў і карэктуры правоў, якія на гэтым сойме не завяршыліся* [33, s. 87]. На нашу думку, у соймавых дыярыушах гаворка вялася пра камісію, створаную яшчэ на канвакацыі ў пачатку 1587 г., якая павінна была заняцца распрацоўкай польскага статута і паправай Трыбунала Кароны Польскай [33, s. 21]. Лічым, што і на каранацыйным сойме 1587–1588 гг. дэлегацыя ВКЛ не абмяркоўвала норм Статута ВКЛ з польскім бокам (хаця, напэўна, каронныя паслы і спрабавалі гэта зрабіць), а імкнулася дабіцца яго зацвярджэння непасрэдна ад Жыгімонта Вазы.

У выніку дэлегацыя ВКЛ скарысталася цяжкай унутрыпалітычнай сітуацыяй у Рэчы Паспалітай і вымусіла новага манарха ды каронны бок пайсці на саступкі. На пасяджэнні 27 студзеня 1588 г. прадстаўнікі ВКЛ пагражалі ўвогуле пакінуць Кракаў і не прызнаць каранацыі Жыгімонта Вазы, калі кароль не прыме іх умоў. Увечары таго ж дня Жыгімонт Ваза вымушаны быў зацвердзіць Статут ВКЛ і мір з Маскоўскай дзяржавай, а таксама прысягнуў на захаванне правоў і вольнасцей ВКЛ. Дэлегацыя ВКЛ, у сваю чаргу, прызнала Жыгімонта Вазу каралём польскім і вялікім князем літоўскім і прынесла яму прысягу на вернасць [9, s. 218–219; 13, s. 413–414][15]. Гэты дэмарш быў рашучым і, як аказалася, вельмі своечасовым палітычным крокам. У крытычных умовах польскім станам проста прыйшлося згадзіцца на зацвярджэнне каралём новага Статута ВКЛ. Хутка пасля прысягі на сойм прыйшлі весткі аб перамозе кароннага вялікага гетмана Яна Замойскага над войскамі Максімільяна ў бітве пад Бычынай 24 студзеня 1588 г. і захопе эрцгерцага ў палон. Навіна адразу выявіла сапраўдную пазіцыю польскіх сенатараў і паслоў. Некаторыя з іх адкрыта заяўлялі, што не дапусцілі б зацвярджэння пастулатаў ВКЛ, калі б інфармацыя аб паражэнні эрцгерцага Максімільяна прыйшла крыху раней[16] [9, s. 219–220; 11, s. 50–51; 13, s. 417].

Новы кароль і вялікі князь 28 студзеня 1588 г. яшчэ ў час каранацыйнага сойма выдаў прывілей аб зацвярджэнні і ўвядзенні ў дзеянне Статута ВКЛ. Каб зняць усякія сумненні ў легітымнасці прыняцця кадыфікацыйнага акта, у прывілеі было ад-

---

[10]Там жа. Sygn. 196. S. 2.
[11]AGAD. Arch. Publicz. Potockich. Zb. Dyaryuszów seymowych za panowania Zygmunta III. T. 1 (1585–1607). Sygn. 31. S. 272.
[12]Там жа. S. 178–183, 284–287.
[13]Там жа. S. 181.
[14]Там жа. S. 246.
[15]Там жа. S. 187–189, 189–292.
[16]Там жа. S. 292.

значана, што ён быў абмеркаваны на сойме ўсімі бакамі – каралём, сенатарамі і пасламі Польшчы ды ВКЛ: *…намовившисе в томъ с паны радами нашими и зо въсими станы обоего народу на сойме вальномъ, коронацыи нашое будучими.* Здымаліся і асцярогі адносна парушэння яго нормамі ўмоў Люблінскай уніі, бо новы Статут ВКЛ *списомъ унии ни в чомъ противенъ быти и ничого шкодити и уближати не маеть* [34, с. 42–43]. Яшчэ адзін гаспадарскі прывілей, выдадзены 1 лютага 1588 г., замацоўваў шэраг пастулатаў, прадстаўленых на каранацыі дэлегацыяй ВКЛ, у тым ліку задавальняў просьбу аб зацвярджэнні новага акта кадыфікацыі [13, s. 415–418; 35, с. 4–5]. У абодвух прывілеях шляхце ВКЛ гарантавалася магчымасць самастойна рэфармаваць сваё права: *…вольность правъ ихъ и Статуту поправу* [34, с. 43; 35, с. 4]. Дададзім таксама, што пакольκі на самой справе статутныя нормы на пасяджэннях каранацыі з палякамі не абмяркоўваліся, то і рашэнне аб зацвярджэнні Статута ВКЛ у соймавыя канстытуцыі, прынятыя 30 студзеня 1588 г., не ўвайшло [33, s. 62–88]. Дарэчы, частка польскай шляхты ўспрымала новы Статут ВКЛ як парушэнне ўмоў уніі, бачыла ў некаторых яго нормах уціск сваіх правоў, нават ставіла пад сумненне легітымнасць гэтага акта кадыфікацыі. На працягу 1590-х гг. каронныя соймікі неаднаразова патрабавалі правесці на сойме абмеркаванне велікакняжацкага акта кадыфікацыі ці ўвогуле прапаноўвалі яго скасаваць [11, s. 52–53]. Аднак палітычны народ ВКЛ прынцыпова настойваў на тым, каб не дапускаць польскі бок да рэдагавання статутных норм. Так, у інструкцыі паслам Ашмянскага павета на вальны сойм 1590 г. адназначна сцвярджалася: *А поправованья и корыкгованья статуту нашого через паны поляки панове послове нашы весполокъ зъ их м(и)л(ос)тью паны радами и паны послы иншыми маютъ пилно боронити и недопущати, кгдыж над список унии, панове поляцы ничого до нашых прав не мають, и поправа их не им, але нам належыть*[17] [36, с. 73]. У сувязі з гэтым асабліва падкрэслім, што Статут ВКЛ 1588 г. ніякім чынам не парушаў асноў дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і не вёў да разрыву Люблінскай уніі 1569 г. Аднак ён абараняў партыкулярныя інтарэсы велікакняжацкай шляхты ва ўмовах уніі з Каронай Польскай і ўмацоўваў унутраную самастойнасць ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай [2, с. 24, 27; 4, s. 67; 11, s. 43; 13, s. 419–420].

Такім чынам, у працэсе распрацоўкі і прыняцця Трэцяга статута ВКЛ яскрава выявілася перапляценне дзвюх тэндэнцый грамадскага жыцця Рэчы Паспалітай: партыкулярнай і ўніфікатарскай. Палітычны народ Кароны Польскай уяўляў унію як паступовае прывядзенне да аднастайнасці ўсіх сацыяльна-палітычных адметнасцей розных суб'ектаў Рэчы Паспалітай, ператварэнне яе ў *адно непадзельнае і неадрознае цела*. Уніфікацыя права Польшчы і ВКЛ была адным з найважнейшых крокаў на гэтым шляху. Аднак для шляхты ВКЛ прынцыповае значэнне мела захаванне сваёй унутранай палітычнай адасобленасці, надзейным гарантам чаго якраз і з'яўлялася ўласная прававая сістэма. Менавіта гэта абумовіла той факт, што праца па збліжэнні сістэм права Кароны Польскай і ВКЛ у 1569–1588 гг. ператварылася ў працу па ўмацаванні асобнай прававой сістэмы ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Стварэнне новага Статута ВКЛ стала вынікам самастойнай праватворчай дзейнасці шырокіх колаў беларускай і літоўскай шляхты. Яго падрыхтоўка адбывалася ў асобных камісіях, на сойміках і з'ездах ВКЛ. Для зацвярджэння манарху на вальных соймах Рэчы Паспалітай выносіліся ўжо ўзгодненыя артыкулы або акт кадыфікацыі цалкам, што дазваляла і захаваць юрыдычную працэдуру прыняцця законаў, і адначасова абмежаваць умяшанне польскага боку ў працэс распрацоўкі Статута ВКЛ.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Volumina Constitutionum. T. II (1550–1609), vol. 1 (1550–1585) / przygot. S. Grodziski [i in.]. Warszawa : Wydaw. Sejm., 2005.
2. *Падалінскі У.* Барацьба шляхты за суверэнітэт ВКЛ пасля Люблінскай уніі 1569 г. // Беларус. гіст. часоп. 2016. № 7. С. 23–28.
3. *Ambroziak T.* The Necessity to Reexamine the Question of Lithuanian Particularism during the Reign of Sigismund III and Władysław IV // Zap. Hist. 2014. T. 79, zesz. 4. S. 89–109.
4. *Błaszczyk G.* Rzeczpospolita w latach 1569–1795: węzłowe probłemy stosunków polsko-litewskich // Zap. Hist. 1998. T. 63, zesz. 1. S. 59–80.
5. *Godek S.* Elementy prawa rzymskiego w III Statucie litewskim (1588). Warszawa : Oficyna Naukowa, 2004.
6. *Лаппо И. И.* Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Опыт исследования политического и общественного строя : в 2 т. Т. 1. СПб. : Тип. И. Н. Скороходова, 1901.
7. *Лаппо И. И.* Люблинская уния и третий Литовский статут // Журн. М-ва нар. просвещ. 1917. № 5. С. 89–150.
8. *Лаппо И. И.* Литовский Статут 1588 года : в 2 т. Т. 1. Исследование. Ч. 1–2. Каунас : Spindulio, 1934–1936.
9. *Wisner H.* Z dziejów zatwierdzenia III Statutu Wielkiego Księstwa Litewskiego // Czasop. Prawno-Hist. 1983. T. 35, zesz. 1. S. 214–220.
10. *Wisner H.* Unia Lubelska i III Statut Litewski z roku 1588 // Zap. Hist. 1986. T. 51, zesz. 1. S. 23–43.
11. *Bardach J.* O dawnej i niedawnej Litwie. Poznań : Uniw. Im. Adama Mickiewicza w Pozn., 1988. S. 39–53.

[17] AGAD. Arch. Radziwiłłów. Dział II. Sygn. 242. S. 7–8.

12. *Bardach J.* Statuty litewskie jako wyraz kultury prawnej epoki i ich oddziaływanie na kraje sąsiednie // Dzieje Lubelszczyzny. T. VI. Między Wschodem i Zachodem. Cz. I. Kultura umysłowa / pod red. J. Kłoczowskiego. Warszawa, 1989. S. 305–338.
13. *Lulewicz H.* Gniewów o unię ciąg dalszy. Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1588. Warszawa : Wydaw. Neriton, 2002.
14. *Zakrzewski A.* Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). Prawo – ustrój – społeczeństwo. Warszawa : Campidoglio, 2013.
15. *Радоман А.* Статутовая комиссия, созданная на Гродненском сейме 1568 г. в контексте разработки концепции третьей кодификации права ВКЛ // Литовская Метрика и Литовский Статут как источниковедческая база для славистики и балканистики : тез. докл. Междунар. науч. конф. (Москва, 23–25 нояб. 2006 г.). М., 2006. С. 24–25.
16. Дневник Люблинского сейма 1569 года: соединение Великого княжества Литовского с Королевством Польским / изд. М. Коялович. СПб. : Печатня В. Головня, 1869.
17. *Доўнар Т. І., Сатолін У. М., Юхо Я. А.* (склад.). Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года / рэдкал.: Т. І. Доўнар [і інш.]. Мінск : Тэсей, 2003.
18. *Подозерская Г. Ф.* Второй Литовский Статут. (К истории его составления) // Ист. зап. 1945. Т. 17. С. 53–75.
19. Русская историческая библиотека : в 39 т. Т. 30. Литовская Метрика. Отд. 1–2. Ч. 3. Книги публичных дел / ред. И. И. Лаппо. Юрьев : Изд-во Акад. наук, 1914.
20. *Падалінскі У. А.* Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017.
21. *Lulewicz H.* Najstarsza znana instrukcja sejmikowa z Wielkiego Księstwa Litewskiego. Sejmik wileński przed sejmem warszawskim 1570 roku // Studia historyczno-prawne : pr. dedykow. profr. J. Seredyce w 75-tą rocz. urodzin i 40-lecie pr. naukowej / pod red. J. Dorobisza, W. Kaczorowskiego. Opole, 2004. S. 171–180.
22. *Радаман А.* Інструкцыя шляхты Гарадзенскага павета паслам на Варшаўскі сойм 1572 г. з агульнаваяводскага сойміка Трокскага ваяводства, які адбыўся ў Самілішках 9 снежня 1571 г. // Гарадзенскі палімпсест – 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XX стст. / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. Гародня, 2009. С. 246–251.
23. Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. T. 1. Okresy bezkrólewi / Oprac. H. Lulewicz. Warszawa : Wydaw. Neriton, 2006.
24. *Karabowicz A.* Sejm czy król? Przyczynek do problemu prawodawstwa dla Wielkiego Księstwa Litewskiego za panowania Stefana Batorego (1576–1586) // Świat, Europa, mała ojczyzna : stud. ofiar. profr. S. Grodziskiemu w 80-lecie urodzin / red. M. Małecki. Bielsko-Biała, 2009. S. 189–207.
25. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці / рэд. Ю. С. Пшыркоў. Мінск : Навука і тэхніка, 1975.
26. Postanowienia na sejmiku wilkijskim w ziemi żmudzkiej roku 1576 marca 28 dnia // Kwart. hist. 1902. R. 16, zesz. 3. S. 457–458.
27. Zbiór pamiętników do dziejów polskich : w 4 t. / wyd. W. de Broel-Plater. T. 4. Warszawa : Drukarnia Gazety Codz., 1859.
28. *Лаппо И. И.* Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия. Литовско-русский повет и его сеймик. Юрьев : Тип. К. Маттисена, 1911.
29. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией : в 39 т. Т. 7. Акты гродненского гродского суда (1510–1784). Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1874.
30. Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. T. 2. Okresy panowań królów elekcyjnych XVI–XVII wiek / oprac. H. Lulewicz. Warszawa : Wydaw. Neriton, 2009.
31. Dyaryusze sejmowe roku 1585. W dodatkach: ułamki dyaryusza sejmowego roku 1582, akta sejmikowe i inne akta odnoszące się do sejmu 1585 r. / wyd. A. Czuczyński, Kraków : Nakl. Akademii Umiejet., 1901.
32. *Радаман А.* Інструкцыя Навагародскага сойміка паслам на элекцыйны сойм 1587 г. // Беларус. гіст. агляд. 2003. Т. 10, сш. 1–2 (18–19). С. 163–174.
33. Volumina Constitutionum. T. II (1550–1609), vol. 2 (1587–1609) / przygot. S. Grodziski. Warszawa : Wydaw. Sejm., 2008.
34. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1989.
35. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею : в 5 т. Т. 4. 1588–1632 гг. СПб. : Тип. Э. Праца, 1851.
36. *Лойка П. А.* Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI–першай трэці XVII ст. Мінск : БДУ, 2002.

## References

1. Grodziski S., Dwornicka I. Uruszczak W. (eds). Volumina Constitutionum. T. II (1550–1609), vol. 1 (1550–1585). Warszawa : Wydaw. Sejm., 2005 (in Pol., in Lat.).
2. Padalinski U. The Nobility Struggle for the GDL Sovereignty after the Union of Lublin of 1569. *Belarus. gistar. chasopis* [Belarus. Hist. J.]. 2016. No. 7. P. 23–28 (in Belarus.).
3. Ambroziak T. The Necessity to Reexamine the Question of Lithuanian Particularism during the Reign of Sigismund III and Władysław IV. *Zap. Hist.* T. 79. 2014, zesz. 4. S. 89–109.
4. Błaszczyk G. Rzeczpospolita w latach 1569–1795: węzłowe probłemy stosunków polsko-litewskich. *Zap. Hist.* 1998. T. 63, zesz. 1. S. 59–80 (in Pol.).
5. Godek S. Elementy prawa rzymskiego w III Statucie litewskim (1588). Warszawa : Oficyna Naukowa, 2004 (in Pol.).
6. Lappo I. Velikoe knyazhestvo Litovskoe za vremya ot zaklyucheniya Lyublinskoi unii do smerti Stefana Batoriya (1569–1586). Opyt issledovaniya politicheskogo i obshchestvennogo stroya [The Grand Duchy of Lithuania from the Conclusion of the Union of Lublin to the Death of Stephan Bathory (1569–1586). Experience in the Study of the Political and Social System] : in 2 vols. Vol. 1. Saint Petersburg : Tipogr. I. N. Skorokhodova, 1901 (in Russ.).
7. Lappo I. [The Union of Lublin and the Third Lithuanian Statute]. *Zhurn. Minist. nar. prosveshcheniya* [The J. of the Minist. of Public Educ.]. 1917. No. 5. P. 89–150 (in Russ.).

8. Lappo I. Litovskii Statut 1588 goda [The Lithuanian Statute of 1588] : in 2 vols. Vol. 1. Issledovanie [Research]. Part 1–2. Kaunas : Spindulio, 1934–1936 (in Russ.).
9. Wisner H. Z dziejów zatwierdzenia III Statutu Wielkiego Księstwa Litewskiego. *Czasop. Prawno-Hist.* 1983. T. 35, zesz. 1. S. 214–220 (in Pol.).
10. Wisner H. Unia Lubelska i III Statut Litewski z roku 1588. *Zap. Hist.* 1986. T. 51, zesz. 1. S. 23–43 (in Pol.).
11. Bardach J. O dawnej i niedawnej Litwie. Poznań : Uniw. im. Adama Mickiewicza w Pozn., 1988. S. 39–53 (in Pol.).
12. Bardach J. Statuty litewskie jako wyraz kultury prawnej epoki i ich oddziaływanie na kraje sąsiednie. In: *Dzieje Lubelszczyzny.* T. VI. Między Wschodem i Zachodem. Cz. I. Kultura umysłowa. Warszawa, 1989. S. 305–338 (in Pol.).
13. Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1588. Warszawa : Wydaw. Neriton, 2002 (in Pol.).
14. Zakrzewski A. Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). Prawo – ustrój – społeczeństwo. Warszawa : Campidoglio, 2013 (in Pol.).
15. Radoman A. [Statutory Commission, Established at the Hrodna Diet of 1568, in the Context of the Development of the Third Codification's Concept of the GDL Law] In: *Litovskaya Metrika i Litovskii Statut kak istochnikovedcheskaya baza dlya slavistiki i balkanistiki* [Lithuanian Metrics and the Lithuanian Statute as a Source Base of Knowledge for Slavonic Studies and Balkan Studies] : abstr. of the Int. sci. conf. (Moscow, 23–25 Novemb., 2006). Moscow, 2006. P. 24–25 (in Russ.).
16. Koyalovich M. (ed.). [The Diary of the Lublin Diet of 1569: the Connection of the Grand Duchy of Lithuania with the Kingdom of Poland]. Saint Petersburg : Pechatnya V. Golovina, 1869 (in Pol., in Russ.).
17. Downar T. I., Satolin U. M., Juho Ja. A. (compil.). Statut Vjalikaga Knjastva Litowskaga 1566 goda [The Statute of the Grand Duchy of Lithuania of 1566]. Minsk : Tesej, 2003 (in Belarus.).
18. Podozierskaya G. [The Second Lithuanian Statute. (To the History of its Drafting)]. *Istoricheskie zap.* [Hist. rec.]. 1945. Vol. 17. P. 53–75 (in Russ.).
19. Russkaya istoricheskaya biblioteka [Russian Historical Library] : in 39 vols. Vol. 30. Litovskaya Metrika. [Lithuanian Metrics. First–Second Department]. Part 3. Knigi publichnykh del [Books of Public Affairs]. Yuryev : Publ. house at the Acad. of Sci., 1914 (in Russ., in Belarus., in Pol.).
20. Padalinski U. A. Pradstawnictva Vjalikaga Knjastva Litowskaga na Ljublinskim sojme 1569 goda: udzel u pracy pershaga val'naga sojma Rjechy Paspalitaj [The Representation of the Grand Duchy of Lithuania at the Lublin Diet of 1569: Participation in the Activities of the First General Diet of the Commonwealth]. Minsk : A. M. Janushkevich, 2017 (in Belarus.).
21. Lulewicz H. Najstarsza znana instrukcja sejmikowa z Wielkiego Księstwa Litewskiego. Sejmik wileński przed sejmem warszawskim 1570 roku. In: *Studia Historyczno-Prawne* : pr. dedykow. profr. J. Seredyce w 75-tą rocz. urodzin i 40-lecie pr. naukowej. Opole, 2004. S. 171–180 (in Pol.).
22. Radaman A. [The Nobility Instruction of the Hrodna District for its Representatives to the Warsaw Diet in 1572, Given from the Common for the Trakai Voivodship dietines, which was Held in Samilishki on December 9, 1571]. In: *Garadzenski palimpsest – 2009. Dzjarzhawnyja wstanovy i palitychnae zhyccjo. XV–XX stst.* [Hrodna palimpsest – 2009. Public Institutions and Political Life. XV–XX centuries]. Harodnia, 2009. P. 246–251 (in Belarus.).
23. Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. T. 1. Okresy bezkrólewi. Warszawa : Wydaw. Neriton, 2006 (in Pol., in Belarus., in Lat.).
24. Karabowicz A. Sejm czy król? Przyczynek do problemu prawodawstwa dla Wielkiego Księstwa Litewskiego za panowania Stefana Batorego (1576–1586). In: *Świat, Europa, mała ojczyzna :* stud. ofiar. Profr. Stanisławowi Grodziskiemu w 80-lecie urodzin. Bielsko-Biała, 2009. S. 189–207 (in Pol.).
25. Pshyrkow J. S. (ed.). Pomniki starazhytnaj belaruskaj pis'mennasci [The Monuments of Ancient Belarusian Writing]. Minsk: Navuka i tjehnika, 1975 (in Belarus.).
26. Postanowienia na sejmiku wilkijskim w ziemi żmudzkiej roku 1576 marca 28 dnia. *Kwart. Hist.* 1902. R. 16, zesz. 3. S. 457–458 (in Pol.).
27. Broel-Plater W. de. Zbiór pamiętników do dziejów polskich : w 4 t. T. 4. Warszawa : Drukarnia Gazety Codz., 1859 (in Pol., in Lat.).
28. Lappo I. Velikoe knyazhestvo Litovskoe vo vtoroi polovine XVI stoletiya. Litovsko-russkii povet i ego seimik [The Grand Duchy of Lithuania in the second half of the XVI century. The Lithuanian-Russian District and its Dietine]. Yuryev : Tipogr. K. Mattisena, 1911 (in Russ.).
29. Akty, izdavaemye Vilenskoi arkheograficheskoi komissiei [Acts Issued by the Vilna Archeographic Commission] : in 39 vols. Vol. 7. [Acts of the Hrodno Castle Court (1510–1784)]. Vilna : Tipogr. A. G. Syrkina, 1874 (in Russ., in Belarus., in Pol.).
30. Lulewicz H. (ed.). Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. T. 2. Okresy panowań królów elekcyjnych XVI–XVII wiek. Warszawa : Wydaw. Neriton, 2009 (in Pol., in Belarus., in Lat.).
31. Czuczyński A. (ed.). Dyaryusze sejmowe roku 1585. W dodatkach: Ułamki dyaryusza sejmowego roku 1582, akta sejmikowe i inne akta odnoszące się do sejmu 1585 r. Kraków : Nakł. Akademii Umiejęt., 1901 (in Pol., in Lat.).
32. Radaman A. [The Instruction of the Novaharodak dietine for its Representatives to the Election Diet of 1587]. *Belarus. gist. agljad* [Belarus. hist. rev.]. 2003. Vol. 10, issue 1–2 (18–19). P. 163–174 (in Belarus.).
33. Grodziski S. (ed). Volumina Constitutionum. T. II (1550–1609), vol. 2 (1587–1609). Warszawa : Wydaw. Sejm., 2008 (in Pol., in Lat.).
34. Statut Vjalikaga Knjastva Litowskaga 1588. Tjeksty. Davednik. Kamentaryi [The Statute of the Grand Duchy of Lithuania of 1588. Texts. Directory. Comments]. Minsk : BelSE, 1989 (in Belarus.).
35. Akty, otnosyashchiesya k istorii Zapadnoi Rossii, sobrannye i izdannye Arkheograficheskoyu komissieyu [Acts Relating to the History of Western Russia Collected and Published by the Archaeographic Commission] : in 5 vols. Vol. 4. 1588–1632. Saint Petersburg : Typogr. E. Pratsa, 1851 (in Russ., in Belarus., in Pol.).
36. Loyka P. Shlyakhta belaruskikh zyamel' u gramadska-palitychnym zhytstsi Rechy Paspalitai drugoi palovy XVI–pershai tretsi XVII st. [The Nobility of the Belarusian Lands in the Social and Political Life of the Commonwealth of the second half of the XVI – the first third of the XVII century]. Minsk : BSU, 2002 (in Belarus.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 26.01.2018.*
*Received by editorial board 26.01.2018.*